УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ПІЛЮЗІНА НІНА ВАСІЛЬЕЎНА

**МАСТАЧКА**

**25 ЖНІЎНЯ 1944 Г.**

**ФОНД № 439**

**ВОПІС № 1**

**[1960]-2017**

**МІНСК 2026**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 439**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1 | ДАКУМЕНТЫ Н.В. ПІЛЮЗІНАЙ | 1-11 | 1-2 |

## Прадмова

**Пілюзіна Ніна Васільеўна** нарадзілася 25 жніўня 1944 г. у весцы Васілева Смаленскай вобласці Расіі. У 1963 г. скончыла Мінскае мастацкае вучылішча. З 1963 г. па 1968 г. вучылася ў Беларускім тэатральным мастацкім універсітэце (зараз Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў) у П.В. Масленікава.

З 1966 г. уздельнічае ў мастацкіх выстаўках у Беларусі, Бельгіі, Германіі, Іране, Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі, на Украіне, Фінляндыі. З 1978 г. – сябра Беларускага саюза мастакоў (далей – БСМ). З 2004 з'яўляецца лаўрэатам Нацыянальнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

Працуе ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (габелен, батык), а таксама ў графіцы (акварэль) і тэмпера. Асноўныя творы: габелены "Апошні ліст" (1969), "Легенда пра возера Svіцязь" (1972), "Навука пра зоркі" (1975), "Перад зорнай дарогай" (1976), "Святочная ноч" (1977), "Летні дождж" (1981), "Беларусь" (1982), "Ой, ляцелі гусі…" (1982), "Несціханы боль" (1984), цыкл "Беларускае вяселле" (1988-1989), "Няўмольны час" (1996), "Кліч зямлі" (1999), "Абуджэнне" (1999); трыпціх "Легенды Мядзельшчыны" (1984); батыкі "За акном мае вішні" (1994), "Летнія ліўні" (1994); серыя батыкаў "Рэха кахання" (1995); акварэлі "Хрызантэмы" (1975), "Сумны бэз" (1997) і інш.

Творы Н.В. Пілюзінай знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах БСМ і Міністэрства культуры Расіі, Музеі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў Маскве, Музеі незалежнасці ў Варшаве (Польшча), Музеі народнай Славы ў Мядзелі, Баранавіцкім краязнаўчым музеі, Літаратурным музеі Я. Купалы ў Мінску, у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў Мінска.

Жыве ў аг. Ратамка Мінскай вобласці.

Дакументы Н.В. Пілюзінай паступілі ў БДАМЛМ ад яе самой у 2002 годзе. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшло 11 спраў (57 дак.) за [1960]-2017 гг.

Вопіс складаецца з аднаго раздзела "Дакументы Н.В. Пілюзінай", які сістэматызаваны па намінальна-храналагічнаму прынцыпу ([1960]-2017 гг.).

Прадмову склала
Архівіст
10.04.2026 А.С. Праліч

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 15.05.2026
№ 7

ФОНД № 439
ВОПІС № 1
[1960]-2017

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1 ДАКУМЕНТЫ Н.В. ПІЛЮЗІНАЙ** | | | | |
| | Творчыя дакументы Н.В. Пілюзінай | | | | |
| 1 | Н.В. Пілюзіна. "Далёкі кліч", "Навука аб зорках", "Перад зорнай дарогай" і інш. Габелены. Рэпрадукцыі | 1972-2000 | 10 | 7 | |
| | *** | | | | |
| 2 | Дароўны надпіс Леокадзіі Маціеўскай Н.В. Пілюзінай ад 23 сакавіка 1993 г. на тытульнай старонке газеты "Вечерний Минск" | | 2 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 3 | Дароўны надпіс Святланы Ішчанкі Н.В. Пілюзінай ад 14 верасня 2001 г. на тэксце інтэрв'ю Н.В. Пілюзінай карэспандэнту газеты "Культура" С. Ішчанка. Выразка з газеты | | 1 | 1 | |
| 4 | Каталогі выставак з удзелам Н.В. Пілюзінай "Сучасны габелен беларускіх мастакоў", "Эксперыментальны тэкстыль" і інш. (на беларускай і польскай мовах) | 1987-2002 | 74 | 3 | |
| 5 | Запрашэнні і інш. на персанальныя выстаўкі Н.В. Пілюзінай "Безыменная таямніца", "Габелен, батык", "Рэха кахання" і інш. | 1996-2001 | 14 | 7 | |
| | *** | | | | |
| 6 | Рэкламныя буклеты персанальных выстаў Н.В. Пілюзінай "Габелен, бацік.", "…Ля сіняй бухты…" і інш. | 1996-2017 | 8 | 3 | |
| 7 | Артыкулы пра і са згадкай Н.В. Пілюзінай "Вясна зязюляй кукавала", "Ой, летели гуси", "Ратомское чудо Нины Пилюзиной" і інш. Некаторыя з рэпрадукцыямі яе прац. Выразкі с газет і часопіса | 1982-2002 | 70 | 23 | |
| | *** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 8 | С. Галавецкі. "Маленькая родина Нины Пилюзиной", Л. Крушынская "Безыменная таямніца"<br>Сцэнарыі дакументальных фільмаў пра Н.В. Пілюзіну<br>Машынапіс | 1996 | 10 | 2 | |
| 9 | Г. Драбатава "О выставке Н.В. Пилюзиной в Гродно"<br>Машынапіс<br>Верш, прысвечаны Н.В. Пілюзінай | 2001 | 1 | 1 | |
| 10 | Фотаздымкі Н.В. Пілюзінай, індывідуальныя<br>Некаторыя - з анатацыямі | 1999-2001 | 5 | 5 | |
| 11 | Фотаздымкі Н.В. Пілюзінай ў групах з мастакамі і інш. | [1960]-1999 | 4 | 4 | |

У дадзены вопіс унесена 11 (адзінаццаць)

спраў з № 1 па № 11 , 57 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонду зрабіла

архівіст ______________________ А.С. Праліч

2026

Дакументы прынялі:

вяд. архівіст аддзела ______________________ В.І. Бярэйшык

забеспячэння захаванасці дакументаў ______________________

"_____"____________20____ г.